# Даследаваць спадчыну

## Чым стаў адметны I абласны літаратурна-краязнаўчы форум «Воранаўскія чытанні»

**Мерапрыемства прайшло ў рамках супрацоўніцтва Гродзенскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Я. Купалы, Воранаўскага райвыканкама, пры ўдзеле Саюза пісьменнікаў Беларусі. А мэта форуму — развіццё творчага і інтэлектуальнага патэнцыялу навучэнцаў, патрыятычнае выхаванне праз далучэнне іх у краязнаўчую дзейнасць. І, трэба сказаць, юныя даследчыкі прадставілі грунтоўныя і, у нейкай ступені, навуковыя работы, якія атрымалі высокую ацэнку журы.**

Пляцоўкай форуму сталі некалькі аб'ектаў раёна. Так, у Цэнтры культуры і народнай творчасці госці змаглі пазнаёміцца з найлепшымі здабыткамі Воранаўскага раёна — турыстычным патэнцыялам, арыгінальнымі напрацоўкамі раённай бібліятэкі, творамі самабытных майстроў. Тут можна было ўбачыць вырабы з саломкі Ларысы Самошкінай, выцінанкі Галіны Мялько, ткацкія ўзоры Анжэлы Ладыш, тэатр моды прадставіла Пагародненская сярэдняя школа.

— Несумненна, «Воранаўскія чытанні» — гэта чарговы этап паглыблення супрацоўніцтва паміж органамі ўлады і ВНУ, — падкрэсліў падчас адкрыцця форуму **старшыня Воранаўскага райвыканкама Дзмітрый ЗАХАРЧУК**. — Сёння мы стварылі аснову, якая з гадамі прырасце. Форум будзе развівацца і ўдасканальвацца. Галоўная яго задача — выхоўваць падрастаючае пакаленне, ствараць магчымасці для навуковай і творчай самарэалізацыі нашых дзяцей, бо яны — будучыня Беларусі.

**Першы прарэктар ГрДУ Аляксандр КАРЭЎСКІ** зазначыў, што важкім падмуркам форуму з'яўляецца папярэдняя сумесная дзейнасць навукоўцаў з райвыканкамам, вынікам якой стала выданне трохтомніка «Мая Воранаўшчына». Гэта сапраўдны рэкорд — выпусціць усяго за год



Фота voran.by

тры кнігі, дзе сабраны легенды і паданні, проза і паэзія гэтага краю.

**Старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ** накіраваў у адрас удзельнікаў прывітальны ліст. У ім, у прыватнасці, ён зазначае: «Размова пра роднае, блізкае заўжды адбываецца ў кантэксце адкрыцця самых сакральных, самых фундаментальных ісцін нашага чалавечага жыцця. Нельга стаць патрыётам, нельга заставацца моцным і дзеяздольным грамадзянінам, сапраўдным будаўніком нашай дзяржавы і гуманістычнага грамадства без сілкавання тым, што з дзяцінства даюць чалавеку сям'я, родныя і блізкія людзі, роднае паселішча, веданне сваіх каранёў, прытрымліванне гістарычных традыцый».

Работа форуму вялася па некалькіх секцыях, якія прайшлі ў школах раёна. Свае работы прадставілі школьнікі 7—11 класаў і навучэнцы Воранаўскага дзяржаўнага каледжа.

Па словах члена журы, **паэтэсы Марыны КАНДРАТОВІЧ**, юныя навукоўцы адпраўляліся ў міні-экспедыцыі, каб дасканала вывучыць мінулае роднага краю, даведацца аб яго славутых людзях,



адкрыць самабытную культуру. Сабраны матэрыял быў прадстаўлены на суд журы. Бясспрэчнымі лідарамі форуму прызнаны вучні Дар'я Мерава і Сандра Сварабовіч з Канвелішскай школы, Аляксандр Белагаловы, Валерыя Карпінская і Ганна Грэмза з Радунскай школы, а таксама канвелішскія настаўнікі Наталля Якжык і Надзея Адамчык.

Старшыня журы паэтычнага конкурсу «Воранаўшчыне прысвячаецца», **член Саюза пісьменнікаў Беларусі, паэт, літаратурны крытык Дзмітрый РАДЗІВОНЧЫК,** назваў крытэрыямі ацэнкі любоў да роднага слова, імкненне праявіць сябе ў творчасці сапраўдным патрыётам.

— Што датычыцца творчага росту — ён залежыць ад настойлівасці, вернасці гэтым імкненням і пераканаўчасці. Калі нам, дарослым, удасца падтрымліваць цікавасць да літаратурнай творчасці на належным узроўні, майстэрства юных паэтаў будзе расці разам з імі. Важныя неабыякавасць да культурнага жыцця раёна, вобласці, краіны, да адкрытых літаратурных праектаў. Спадзяёмся на тое, што сістэма адукацыі Воранаўскага раёна, раённыя ўлады паспрыяюць стварэнню Воранаўскага раённага літаб'яднання. Усе ўмовы для гэтага ёсць, — лічыць Дзмітрый Радзівончык.

Аб тым, наколькі важна развіваць патэнцыял раёна, паразважаў **дацэнт кафедры беларускай філалогіі ГрДУ імя Я. Купалы, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Руслан КАЗЛОЎСКІ**. Ён звяртае ўвагу на багатую спадчыну Воранаўскага краю, якая магла б па-новаму цікавіць гісторыкаў ці літаратараў, у прыватнасці, звязаную з мясцінамі Адама Міцкевіча. Ёсць тут нямала і сваіх літаратараў, якія здольны друкавацца. Гэтаму садзейнічаюць цесныя сувязі раёна з кафедрай беларускай філалогіі ГрДУ імя Я. Купалы. Напрыклад, нямала мерапрыемстваў ладзіцца падчас школьнага краязнаўчага летніка ў вёсцы Канвелішкі, удзельнікі якога якраз і займаюцца такой даследчай дзейнасцю.

Як старшыня журы конкурсу «Воранаўшчына: культурная спадчына роднага краю», Руслан Канстанцінавіч адзначыў разнастайнасць дакладаў, за якімі стаіць значная пошукавая праца. Напрыклад, разглядаліся архітэктурныя асаблівасці вернутай з небыцця каталіцкай капліцы, таямніцы бабулінага куфра, у тым ліку, яго віды, унікальныя прыклады ткацтва і многае іншае. Актуальна прагучала выступленне на тэму «Масавае мерапрыемства Воранаўскага раёна як інструмент брэндынга малых тэрыторый».

— Матэрыял, які звязаны з культурнай спадчынай, быў адаптаваным і навукова выверaным. Менавіта навуковая навізна стала асноўным крытэрыем ацэнкі канкурсантаў. Бо падчас «Воранаўскіх чытанняў» было прадстаўлена тое, што не даследавалася раней альбо даследавалася мала. І гэта прыемна ўразіла, — выказаў сваю думку Руслан Казлоўскі.

Ён таксама зазначыў, што матэрыялы форуму будуць мець практычнае значэнне. Гэта праца пойдзе ў вучэбны і выхаваўчы працэс як важны складнік самасвядомасці месцічаў. Бо гэта менавіта тое мерапрыемства, якое ўздымае гонар за сваю малую радзіму, яе здабыткі, натхняе на новыя даследаванні і паэтычныя вобразы.

Таксама вынікі працы літаратурна-краязнаўчага форуму знойдуць сваё ўвасабленне ў спецыяльным выданні. «Воранаўскія чытанні» будуць праходзіць раз у два гады, каб была магчымасць да іх сур'ёзна падрыхтавацца. Мяркуецца, што пашырыцца і яго геаграфія.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

Духоўнасць

# Словам фарміравалася вера

## У Нацыянальнай бібліятэцы праходзяць IX Беларускія калядныя чытанні

**Традыцыйна напярэдадні вялікіх зімовых свят у Беларусі праходзяць калядныя чытанні. У рамках гэтага асветніцкага праекта на працягу месяца на розных пляцоўках краіны адбываюцца выстаўкі, круглыя сталы, канферэнцыі. Удзельнікі сустрэч уздымаюць пытанні, якія датычацца супрацьстаяння сучасным выклікам і захавання духоўна-маральных каштоўнасцяў нашага народа, выхавання падрастаючага пакалення.**

Сёлета IX Беларускія калядныя адукацыйныя чытанні адкрыліся ў Нацыянальнай бібліятэцы 23 лістапада. Ва ўрачыстасці ўзялі ўдзел святары, прадстаўнікі органаў улады, дзеячы культуры, вучоныя, кіраўнікі і выкладчыкі ўстаноў адукацыі.

Калядныя чытанні — гэта ў тым ліку і падвядзенне вынікаў вялікай асветніцкай працы, якую курыруе Праваслаўная царква і да якой далучаюцца разнастайныя арганізацыі і ўстановы. Таму і распачаліся чытанні з узнагароджанняў пераможцаў трох рэспубліканскіх конкурсаў.

Арганізатарам першага, літаратурнага, конкурсу «Кніга мне — кніга ўва мне» выступілі Сінадальны аддзел Беларускай праваслаўнай царквы ў супрацоўніцтве са свецкімі ўстановамі і Саюз пісьменнікаў Беларусі. У рамках яго вызначаліся найлепшыя творы, якія паказваюць духоўна-маральныя хрысціянскія каштоўнасці, без якіх немагчымае гарманічнае развіццё грамадства. Падчас узнагароджання пераможцаў старшыня Саюза пісьменнікаў Алесь Карлюкевіч заўважыў, што падобныя праекты сёння надзвычай важныя: дзякуючы ім чытача можна адцягнуць ад тых кніг, якія перашкаджаюць выхаваць чалавека высокамаральнага, дзяржаўнага, удумлівага, які разумее, што адбываецца ў грамадстве.

Традыцыйна на Беларускіх калядных чытаннях падводзяцца вынікі конкурсу «Святло міласэрнасці», які арганізаваны з мэтай падтрымкі і распаўсюджвання вопыту супрацоўніцтва ўстаноў сацыяльнага абслугоўвання з царкоўнымі арганізацыямі, а таксама валанцёрскай дзейнасці. Так, найлепшымі ў гэтым годзе сталі тэрытарыяльны цэнтр сацыяльнага абслугоўвання насельніцтва Баранавіцкага раёна, Гарадзішчанскі дом-інтэрнат для дзяцей-інвалідаў з асаблівасцямі псіхафізічнага развіцця, Браслаўскі дом-інтэрнат для састарэлых і інвалідаў. Таксама былі адзначаны за сацыяльнае служэнне валанцёры.

Традыцыйна падчас калядных чытанняў падводзяцца і вынікі конкурсу «Бібліятэка — цэнтр духоўнай асветы і выхавання». Мітрапаліт Мінскі і Заслаўскі Веніямін заўважыў, што праекты, якія робяць супрацоўнікі бібліятэк, прыносяць свае вынікі, натхняюць як падрастаючае пакаленне, так і людзей старэйшага ўзросту на добрыя справы.

У рамках калядных чытанняў прайшла прэзентацыя кніжнай калекцыі «Рускія пісьменнікі — класікі і праваслаўе». Гэта серыя з дванаццаці кніг, якія змяшчаюць творы класікаў за тры стагоддзі рускага прыгожага пісьменства — ад Ламаносава да Шолахава. Як паведаміў кіраўнік Міжнароднага фонду духоўнага адзінства народаў, прафесар, доктар філасофіі Валерый Аляксееў, калекцыя ўжо прэзентавалася ў Пекіне, Берліне, Мілане, Вене, Варшаве, Парыжы, Іерусаліме ды іншых гарадах. У гэтым годзе было прынята рашэнне прадставіць яе ў гарадах СНД. Яна ўжо пабывала ў Ерэване, Ташкенце, Душанбэ, Бішкеку.

У Беларусі наборы кніг перададзены ў Нацыянальную бібліятэку, розныя ўстановы і арганізацыі краіны. Адметнасць серыі ў тым, што ў кожнай з яе кніг паказваецца складаны духоўны шлях пісьменніка, звароты да праваслаўя, у сюжэтах раскрываюцца людскія лёсы, перажыванні, пошукі. «Калекцыя дэманструе ролю літаратуры, што ўсе стагоддзі яна натхняла, давала сілы. Цяжка ўявіць, як бы мы жылі ў свеце, калі б не было Пушкіна, Ясеніна. Гэта іншае вымярэнне. Гэта словы небахкыхарой. Менавіта словам фарміравалася і вера», — заўважыў Валерый Аляксееў.

Падчас пленарнага пасяджэння мітрапаліт Веніямін, адзначыў, што калядныя чытанні невыпадкова сёлета прысвечаны асэнсаванню шматвяковага шляху праваслаўя і культуры на беларускіх землях — без ведання гісторыі немагчыма рабіць прагнозы на будучыню. Дарэчы, многія выступоўцы ў сваіх дакладах адзначылі, наколькі карысным мог быць вопыт папярэднікаў. Яны акрэслілі тыя праблемы, якія падкідвае час. Сёння трэба адстойваць духоўныя каштоўнасці, традыцыйную сям'ю, умацоўваць добрасуседскія адносіны паміж народамі.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**